## ЦІТОЎ ВІКТАР СЦЯФАНАВІЧ – 75

Нарадзіўся ў в. Дрожджанічы Крычаўскага раёна ў 1938 г. Скончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1963). У 1963–1972 гг. працаваў настаўнікам, у 1972–1974 – інспектарам Міністэрства асветы БССР. З 1974 г. – у Гродзенскім педагагічным інстытуце (старшы выкладчык, дацэнт), з 1977 г. – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1993 г. пераходзіць на пасаду загадчыка кафедру Беларускі ўніверсітэт культуры, з 1998 г. – працуе ў Беларускім педагагічным універсітэце імя М. Танка. У 1991 г. абараніў доктарскую дысертацыю, з 1995 г. – прафесар.

В. Цітоў даследуе народныя промыслы і рамёствы, этнічную гісторыю і геаграфію Беларусі, традыцыйна-бытавую нацыянальную культуру, народны каляндар, звычаі, абрады, вераванні, праблемы міжнацыянальных узаемаадносін, польска-беларускія сувязі, праблемы музейнай справы і аховы гісторыка-культурных помнікаў і інш. Ён распрацаваў канцэпцыю гісторыка-этнаграфічнага раянавання Беларусі, якое пакладзена ў аснову экспазіцыйнай структуры Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (скансен).

В. Цітоў – аўтар манаграфій «Народные деревообрабатывающие промыслы Белоруссии (1917–1941 гг.)» (1976), «Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов 19-начала 20 в.» (1983), «Народное наследие: материальная культура в локально-типологическом разнообразии» (1994), «Этнографическое наследие: Беларусь: традиционно-бытовая культура», «Этнографическое наследие: Беларусь: страна и люди» (2001) і інш. Саўтар шэрагу буйных навуковых прац, у т.л. «Проблемы расселения в БССР» (1980), «Памятники этнографии» (1981), «Промыслы и ремесла Белоруссии» (1984), «Праздники и обряды в Белорусской ССР» (1988), «Беларусы» (1998) і інш.

***У.Г. Хамякоў***



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова